**22.** Лён – каштоўная расліна, да якой з павагай адносіліся ва ўсе часы. А дзе ўзнікла першае адзенне з ільняных тканін?
**А)** у Старажытным Егіпце. **Б)** у Месапатаміі. **В)** у Індыі.
**Г)** у Кітаі. **Д)** у Заходняй Еўропе.

**23.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы:
*1) рассадзіць; 2) расада; 3) расселіна; 4) расол.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**24.** У народзе здаўна існуе прыкмета:
*Першы трывалы снег выпадае … .*
**А)** раніцай. **Б)** днём. **В)** надвячоркам. **Г)** вечарам. **Д)** ноччу.

**25.** Дадзены прыметнікі *гаспадарлівы, гаспадарны, гаспадарчы, гаспадарскі*. Якое слова мае значэнне *‘заснаваны на правільным вядзенні гаспадаркі’*?
**А)** усе словы. **Б)** гаспадарлівы. **В)** гаспадарны. **Г)** гаспадарчы. **Д)** гаспадарскі.

**26.** У вершаванай загадцы С. Шах схавалася незвычайнае слова-амонім:
*Вам даю адну хвіліну,*
*Бо сказаць даволі лёгка:*
*Што за тоўстая тканіна –*
*І для тэнісу пляцоўка?*
**А)** грыф. **Б)** корт. **В)** кардон. **Г)** аркуш. **Д)** стадыён.

**27.** Пераблыталіся літары слова, якога не хапае ў вершаваных радках Р. Барадуліна. Знайдзіце правільны адказ.
*Студзень студзіць рунь густую.*
*Люты злосны, ён лютуе.*
*Сок пускае … –*
*Да салодкага прывык.*
**А)** к, а, і, а, к, с, в. **Б)** а, с, а, в, к, і, к, р. **В)** р, е, э, ь, в, н, ч.
**Г)** е, і, н, п, л, ь. **Д)** н, ь, е, в, н, і, ж.

**28.** Выберыце з дадзеных назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку:
*1) сені; 2) абдымкі; 3) дзверы.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**29.** Які адпаведнік у беларускай мове мае руская назва расліны *зверобой*?
**А)** першацвет. **Б)** кураслеп. **В)** святаяннік. **Г)** наперстаўка. **Д)** тлушчанка.

**30.** Як даўней называлі чайнік для заваркі чаю?
**А)** імбрычак. **Б)** імасць. **В)** зэдаль. **Г)** засланка. **Д)** гушча.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 35000 экз. г. Мінск. 2016 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2016»

*Чацвер, 18 лютага 2016 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Н. Гілевіча. Колькі дзеясловаў ужыта ў творы?
*З выраю далёкага*
*Птушкі прыляталі –*
*Гагаталі, ёкалі,*
*Шчоўкалі, свісталі.*
*Засялялі домікі,*
*Майстравалі гнёзды.*
*Слухалі садоўнікі*
*Іх канцэрт узнёслы.*
**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**2.** Знайдзіце “лішняе” слова ў радзе:
*нядзеля, панядзелак, красавік, серада.*
**А)** няма “лішняга” слова. **Б)** нядзеля. **В)** панядзелак. **Г)** красавік. **Д)** серада.

**3.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў вершаваных радках В. Гардзея?
*Срэбрам ранішніх рос,*
*Зорнай яснасцю ночы*
*І пяшчотай бяроз*
*Тваё свецяцца вочы.*
**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**4.** Колькі беларускіх назваў месяцаў маюць на канцы мяккі знак?
**А)** 4. **Б)** 6. **В)** 8. **Г)** 10. **Д)** 12.

**5.** Выберыце з дадзеных прыкладаў толькі назвы абутку.

*1) штаны; 2) чаравікі; 3) тапкі; 4) спадніца; 5) шлёпанцы; 6) шкарпэткі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 3, 5, 6. **Д)** 5, 6.

**6.** У якім(-іх) з дадзеных слове(-ах) “схаваліся” тры жаночыя імені?

*1) вольха; 2) цагліна; 3) раўніна.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 3.

**7.** Якія словы з дадзеных ўжываюцца ў адзіночным і множным ліках?

*1) вядро; 2) сядло; 3) вясло; 4) верацяно.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**8.** Вызначце, якое слова не з’яўляецца садавінай:

*сліва, чарэшня, яблык, цыбуля.*

**А)** няма патрэбнага варыянта. **Б)** сліва. **В)** чарэшня. **Г)** яблык. **Д)** цыбуля.

**9.** Якога слова не хапае на месцы пропуску ў вершаваных радках С. Шушкевіча?

*Цацак з тысячу на ...*
*Нам развесіў чараўнік.*
*Палыхаюцца іголкі*
*У дзіўным казачным агні.*

**А)** сасну. **Б)** елку. **В)** ёлку. **Г)** гірлянду. **Д)** акно.

**10.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх на месцы пропуску трэба напісаць літару ***ш***.

*1) сце..камі; 2) даро..камі; 3) но..камі; 4) узме..камі; 5) усме..камі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** толькі прыклад 5. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 4, 5.

**11.** Які адпаведнік у рускай мове мае назоўнік *канюшына*?

**А)** лошадь. **Б)** конюшня. **В)** клевер. **Г)** сарай. **Д)** телега.

**12.** У якім парадку неабходна размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст?

*1. Сонейка ж усміхнулася, выглянула з-за воблака, абагрэла зямлю і замёрзлага вандроўніка.*
*2. Пачаў Вецер дзьмуць, колькі было моцы.*
*3. Ён падбадзёрыўся, зняў сваю накідку, прывязаў да сядла і паехаў далей.*
*4. Аднойчы Сонца і Вецер заспрачаліся, хто з іх мацнейшы.*
*5. Але чым болей стараўся, тым мацней закутваўся вандроўнік у сваю накідку.*
*6. Нарэшце вырашылі памерацца сілай з вандроўнікам, які ехаў вярхом на кані.*

**А)** 1, 3, 6, 4, 2, 5. **Б)** 2, 4, 5, 3, 6, 1. **В)** 3, 1, 5, 6, 4, 2.
**Г)** 4, 6, 2, 5, 1, 3. **Д)** 5, 2, 4, 1, 3, 6.

**13.** Якія словы з дадзеных аднакаранёвыя?

*1) камар – камень; 2) камень – комін;*
*3) камень – каменны; 4) камар – камарыны.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**14.** Дадзены назоўнікі: *1) гурба; 2) дарога; 3) елка; 4) казка; 5) іголка.* Размясціце словы ў алфавітным парадку.

**А)** 1, 3, 2, 4, 5. **Б)** 1, 4, 3, 5, 2. **В)** 1, 2, 3, 5, 4. **Г)** 2, 1, 4, 5, 3. **Д)** 3, 5, 4, 2, 1.

**15.** Адгадайце народную загадку, слова-адгадка якой “схавалася” ў пераблытаных літарах. *Мяне з дрэва наламалі, потым лыкам абвязалі, але я не сумую, а па хаце ўсё танцую.*

**А)** і, е, н, в, к. **Б)** о, д, я, р, в. **В)** а, г, а, к, р, а, ч. **Г)** а, ч, б, о, к. **Д)** а, у, т, б, р.

**16.** Якія галосныя напішаце пасля літары *т*?

*1) а; 2) я; 3) о; 4) ё; 5) ы; 6) і; 7) у; 8) ю.*

Выберыце патрэбныя варыянты.

**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 1. **В)** 1, 3, 5, 7. **Г)** 2, 4, 6, 8. **Д)** 3, 5, 6.

**17.** Якія словы з дадзеных напісаны правільна?

*1) веце; 2) лісце; 3) узлесе; 4) трысцё.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**18.** Выберыце з прапанаваных прыкладаў віды маўленчай дзейнасці:

*1) аўдзіраванне; 2) гаварэнне; 3) чытанне.*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 1. **В)** няма патрэбных варыянтаў.
**Г)** 1, 2. **Д)** 2, 3.

**19.** Назоўнікі могуць абазначаць: *1) назвы асоб; 2) назвы жывых істот; 3) назвы прадметаў; 4) назвы з’яў прыроды; 5) апрадмечаныя якасці; 6) дзеянні і стан.*

Выберыце з прапанаваных патрэбныя варыянты.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 1, 2, 3, 4. **Д)** 5, 6.

**20.** Які дзеяслоў з дадзеных мае значэнне *‘раскалоць, раздзяліць на часткі, шчапаючы’*?

*1) расчапіць; 2) расшчапіць; 3) расшчаміць.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**21.** Закончыце народныя выслоўі па пачатку:

*1) Што ні край, то ...; 2) Куды ні кінь, ...;*
*3) Колькі ваду ні гатуй, усё ...; 4) Што не чуеш, тое ... .*

*а) вокам бачыш; б) вада будзе; в) не наносіш; г) усюды клін; д) свой звычай.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-д. **Б)** 1-б, 2-в, 3-д, 4-г. **В)** 1-г, 2-а, 3-г, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-д, 3-а, 4-б. **Д)** 1-д, 2-г, 3-б, 4-а.